# Выступленне Я. Я. САКАЛОВА,

## *першага сакратара Цэнтральнага Камітэта Кампартыі Беларусі*

Паважаныя таварышы дэлегаты! Госці з'езда партыі камуністаў! У ходзе перадз'ездаўскай дыскусіі сутыкнуліся інтарэсы глабальнага характару, галоўны водападзел якіх — сацыялістычны выбар. Адданасць яму пацвердзіла пры абмеркаванні перадз'ездаўскіх дакументаў і большасць камуністаў Савецкай Беларусі. Яны выступаюць за адзінства і абнаўленне КПСС, яе вернасць марксізму-ленінізму, яго ўзбагачэнне сучаснымі дасягненнямі чалавечай думкі. Яны выказаліся супраць ідэйных хістанняў і коснасці, згодніцтва і беспрынцыповых кампрамісаў.

Асэнсоўваючы праходзячыя ў КПСС і краіне працэсы, ідэі і палажэнні даклада М. С. Гарбачова, я задаю сабе пытанне: што сёння для нашай партыі набывае асаблівае, я сказаў бы, нават рашаючае значэнне ў яе дзейнасці па аб'яднанню розных палітычных сіл, людзей розных поглядаў і імкненняў, па кансалідацыі грамадства? Перш за ўсё вызначэнне маральных каштоўнасцей такой кансалідацыі. На маю думку, такой асновай можа стаць, па-першае, праясненасць сацыялістычнага ідэалу. Па-другое, гарманізацыя міжнацыянальных адносін, захаванне Саюза суверэнных савецкіх сацыялістычных дзяржаў. І, па-трэцяе, разуменне неабходнасці жыццёва важнага кроку — пераходу да рэгулюемай рыначнай эканомікі. Думаю, нельга абмежавацца ў Праграмнай заяве з'езда ходкім упамінаннем таго, што наш ідэал, цытую па праекту, «убірае ў сябе гуманістычныя асновы чалавечай культуры, спрадвечнай мары аб лепшым жыцці і сацыяльнай справядлівасці». Больш дакладным павінна быць і вызначэнне крытэрыяў сацыялістычнасці, і асабліва тых, якія звязаны з чалавекам, як цэнтрам і сэнсам усёй нашай дзейнасці, рэалізацыяй яго маральнага ідэалу ў камуністычнай перспектыве.

Выступаючы за прыняцце новага Саюзнага дагавора, Кампартыя рэспублікі асноўнай сваёй задачай лічыць дзяржаўнае, палітычнае, эканамічнае і духоўнае адраджэнне Савецкай Беларусі, забеспячэнне правоў і свабод асобы, сацыяльнай абароненасці кожнага яе грамадзяніна.

І асноўны наш клопат аб несціхаючым болі і незагойнай ране нашага народа, пароджанай чарнобыльскай трагедыяй. Больш як 2 млн. чалавек пражывае ў пацярпеўшай зоне. І сёння мы справядліва гаворым: дамоклаў меч Чарнобыля вісіць над народам нашай рэспублікі. Бяду, якая прыйшла на нашу зямлю, немагчыма выразіць толькі ў лічбах і канкрэтных велічынях. Колькі душэўных і фізічных сіл яна ўжо запатрабавала ад нашага народа і колькі яшчэ запатрабуе ў наступныя гады. Становішча ўскладняецца і тым, што цэнтр да апошняга часу фактычна пакідаў Беларусь, яе народ сам-насам з гэтай бядой. Спачатку гэта выражалася ў засакрэчанасці маштабаў і характару катастрофы, потым у палохаючым абвальным патоку адмаўленняў «не» і «не».

Да гэтага часу няма пераканаўчых навуковых распрацовак па ўзроўнях бяспечнага пражывання людзей. Раней жа прынятыя аказаліся негрунтоўнымі. Да гэтага часу ў нашых бальніцах няма сучаснага дыягнастычнага і лячэбнага абсталявання, няма і медыкаментаў, а паток хворых узрастае. Нягледзячы на ўсе прыкладаемыя рэспублікай намаганні, з-за адсутнасці абсталявання зрываецца ўвод магутнасцей на Драгічынскім заводзе, прызначаным для выпуску шпрыцаў аднаразовага прымянення і медыцынскіх прэпаратаў спецыяльна для гэтай зоны. Няма абсталявання і для цэхаў, дзе планавалася выпускаць спецыяльнае дзіцячае харчаванне, зноў жа для тых, хто жыве ў гэтай зоне. Абурэнне выклікаў і падыход да абмеркавання гэтай праблемы ў Вярхоўным Савеце СССР. Толькі паўдня ўдзяліў ён гэтай трагедыі, але затое два дні вырашаў: даць або не даць згоду саюзнай пракуратуры на звальненне двух яе работнікаў. Якую ж прававую дзяржаву мы фарміруем? Які гуманны сацыялізм будуем, калі ў асобе вышэйшага органа дзяржаўнай улады такім чынам расстаўляюцца прыярытэты, дэманструецца яўная пагарда да людской бяды? Чорная калясніца Чарнобыля так або інакш праехалася па лёсах мільёнаў людзей трох саюзных рэспублік. І ім будзе незразумела, калі наш з'езд адмаўчыцца і не прыме дакумента з ацэнкамі Палітбюро і ўрада краіны за слабы ўдзел у выратаванні людзей, якія жывуць у гэтай зоне. Падкрэсліваю, іменна выратаванні.

Што датычыць Кампартыі Беларусі, то ліквідацыю вынікаў аварыі мы лічым сваёй важнейшай праграмнай мэтай. Аб гэтым ясна і недвухсэнсава будзе запісана ў праграмных і нарматыўных дакументах на XXXI з'ездзе КПБ.

Вызначаючы мадэль Кампартыі Беларускай савецкай сацыялістычнай дзяржавы, мы, зразумела, шукаем шляхі яе ўзаемаадносін з КПСС. На маю думку, лепшы прынцып тут — захаваць цэласнасць КПСС, дзейнічаць у адзінстве з ёю. У той жа час дэмакратызацыя унутрыпартыйнага жыцця, логіка развіцця некаторых працэсаў падводзіць нас да неабходнасці перагляду прывычных схем. Узнікае пытанне — што адбудзецца, калі асобныя кампартыі суверэнных сацыялістычных дзяржаў у саставе СССР будуць выкарыстоўваць элементы федэратыўных адносін з КПСС? Падкрэсліваю — іменна элементы. Думаю, у некаторай меры гэта дапушчальна. Час жа пакажа, які шлях з улікам радыкальнага абнаўлення савецкай федэрацыі больш прагрэсіўны, адпавядае інтарэсам як КПСС, так і кампартый саюзных рэспублік.

Наша партыя, з пункту гледжання пазітыўнага і негатыўнага вопыту, шчырай гатоўнасці пакончыць з дэфармацыямі мінулага, радыкальна перабудавацца — з'ява унікальная. У гэтых адносінах ніякія новыя палітычныя арганізацыі не могуць

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы